# «ГОЛОС РАБОЧЕГО» ЯК ДРУКАВАНЫ ОРГАН ЧАСОВАГА УПРАЎЛЕННЯ ГОРАДА БАРАНАВІЧЫ І ПАВЕТА

**М. С. Цюцянькоў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*tyutenkovm@mail.ru;*
*навук. кір. – Н. А. Зубчонак, канд. філал. навук, дац.*

Сацыяльна-палічычнае жыццё жыхароў Заходняй Беларусі было звязана з нацыянальна-вызваленчым рухам, накіраваным на ўз'яднанне з БССР. Друкаваным органам горада Баранавічы і павета была газета «Голос рабочего». У артыкуле прадстаўлены асноўныя напрамкі дзейнасці дадзенага выдання.

***Ключавыя словы:*** перыядычны друк; нацыянальна-выхзваленчы рух; Баранавічы; Заходняя Беларусь.

Газета «Голос рабочего», якая выдавалася ў Баранавічах і ў Баранавіцкім павеце, стала знакавым выданнем для жыхароў: гэта адзіны друкаваны орган, які выходзіў у той перыяд у павеце. Першы нумар быў убачыў свет 21 верасня 1939 г. Выпуск падпісаў І. Новікаў. Гэта быў орган «Часовага Упраўлення горада Баранавічы і Баранавіцкага павета». У той перыяд тэрыторыя горада ўваходзіла ў склад Заходняй Беларусі – на працягу васямнаццаці гадоў: з 1921 – 1939 гг.

17 верасня 1939 года адбылося гістарычнае ўз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі. Жыхары Баранавіцкай зямлі з радасцю сустракалі Чырвоную Армію. Праз чатыры дні пасля вызвалення раёна і выйшаў першы нумар газеты «Голос рабочего». Штомесяц яна выходзіла 15 разоў. За ўвесь перыяд сваёй працы ўсяго надрукавалі 50 выпускаў. Матэрыялы публікаваліся на дзвюх мовах адначасова: беларускай і рускай.

Тэматыка газеты, у першую чаргу, – асвятленне дзейнасці кіруючых органаў на тэрыторыі горада Баранавічы. Як правіла, на адной паласе выдання было па тры-чатыры калонкі маленькага тэкставага шрыфту з засечкамі. «Пролетарыі усіх краін, еднайцеся», – адзін з самых вядомых інтэрнацыяналістычных камуністычных лозунгаў размяшчаўся ў верхнім левым вуглу газеты. Назва знаходзілася ў верхняй частцы паласы ў цэнтры, крыху ніжэй прапісваўся нумар выдання і год.

На старонках газеты друкаваліся загады, распараджэнні Часовага Упраўлення горада Баранавічы, звароты да грамадзян, заявы і пастановы Савецкага ўрада. Значнае месца ў выданні надавалася і выбранню савецкіх органаў кіравання на далучаных тэрыторыях, нацыяналізацыі прамысловасці, а таксама правядзенню тэрытарыяльна-адміністрацыйнага дзялення абласцей, якія ўвайшлі ў склад БССР і інш.

Як адзначаюць даследчыкі, «масавы антыпольскі рэвалюцыйны рух быў разгорнуты на аснове нацыянальнай агітацыі і прапаганды. КПЗБ, Грамада і іншыя дэмакратычныя партыі і арганізацыі здолелі аб’яднаць у палітычнай літаратуры рэвалюцыйныя мэты вызвалення і аб’яднання Заходняй Бедарусі з БССР, вырашыць эканамічныя праблемы праз нацыянальную дзяржаўнасць і развіццё беларускай культуры» [3, с. 135].

Фармат такой газеты быў невялікі. Публікацыі выходзілі на дзвюх палосах. Першая старонка кожнага нумара была адведзена афіцыйным матэрыялам, зваротам да грамадзян. У першым нумары была апублікавана прамова Старшыні Савета Народных Камісараў СССР В. М. Молатава. Там гаварылася аб уваходжанні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад саюзных рэспублік і СССР.

Значнае месца ў газеце надавалася, безумоўна, публікацыям літаратараў, дзеячаў культуры. У першым нумары быў надрукаваны верш П. У. Броўкі «Заходнім Беларусам» – гэта своеасаблівы водгук на падзеі, якія адбыліся ў 1939 годзе:

«…Даволі мучыў вас пракляты польскі кат!

Руку братэрскую прымі, таварыш – родны брат!..»

Таксама быў апублікаваны артыкул А. Т. Твардоўскага «Радасная сустрэча». Пісьменнік дзяліўся ўражаннямі пра сустрэчу воінаўвызваліцеляў з жыхарамі заходніх абласцей Беларусі: «Похоже, что все эти люди впервые в жизни весело и непринуждённо разговаривают, смеются… Глубокая благодарность слышится в каждом слове измученных крестьян, обращённом к бойцам Красной Армии» [1]. Тэкст быў надрукаваны на рускай мове.

Такім чынам, журналісты імкнуліся ахапіць практычна кожнага жыхара Баранавіч, а таксама павета. На старонках публікаваліся і навіны пра культурныя падзеі ў павеце. Напрыклад, 13 кастрычніка ў кінатэатры «Заря» прайшоў канцэрт брыгады Беларускай Дзяржаўнай эстрады. Аб гэтай падзеі ў газеце напісалі так: «У праграме канцэрта: мантаж з твораў савецкіх кампазіатараў і класікаў рускай музыкі, паэма Маякоўскага – “В. І. Ленін”, творы А. М. Горкага і В. Вішнеўскага».

На старонках газеты быў надрукаваны прывітальны ліст І. В. Сталіну [2]. Аб гэтым можна прачытаць на другой паласе № 6 ад 1 кастрычніка: «Масква, Крэмль, Вялікаму Сталіну. Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! Мы настаўнікі ўсіх школ і гімназій горада Баранавічы і павета сабраўшыся на свой гарадскі сход, першае слова любові, адданасці і ўдзячнасці шлём Вам, роднаму і любімаму другу ўсіх працоўных».

Такая газета, як «Голос рабочего», была неабходная для жыхароў Баранавіч і Баранавіцкага павета. Адтуль можна было даведацца пра падзеі ў горадзе, у рэспубліцы, у краіне і аб міжнародным становішчы ў

цэлым. Закраналіся асноўныя праблемы гараджан, друкаваліся аб'явы. «Голса рабочага» – сродак захоўвання і перадачы інфармацыі, дзякуючы якому можна ацаніць узровень жыцця людзей.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Наш край объединенная газета барановичское пкуп [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://kontakt.by/predprijatija/company/15491-наш+край+объединенная+газета+бпкуп/ – Дата доступу: 28.03.2020.
2. О чем писала первая барановичская газета // Яндекс Дзен [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://zen.yandex.ru/media/nashkraj.by/o-chem-pisala-pervaia-baranovichskaia-gazeta-5c7c0de4f5237100b0b21b26 – Дата доступу: 26.03.2020.
3. Слука, А. Г. Беларуская журналістыка (1918 – 1941 гг.) : вучэб.-метад. Комплекс / А. Г. Слука, Н. А. Зубчонак. – Мінск : БДУ, 2015. – 191 с.
4. Советизация Западной Белоруссии (1939 – 1941) // ВикипедиЯ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Советизация_Западной_Белоруссии_(1939–1941) – Дата доступу: 27.03.2020.